IFAE

INTERNATIONAL FOUNDATION
FOR ADULT EDUCATION

# Школа журналістыкі IFAE

# Інтэрв’ю

## як рыхтавацца і правесці размову



IFAE
INTERNATIONAL FOUNDATION
FOR ADULT EDUCATION



# Месца нараджэння

задайце пытанне так, каб атрымаць як мага больш падрабязны адказ

# Пытанні як ключавы інструмент журналіста

## Закрытыя

- На іх можна адказаць адным словам, звычайна «так» або «не».

✅ Калі нам патрэбны дакладны, адназначны і кароткі адказ.

∈ Колькі вам гадоў?
∈ Вы нарадзіліся ў вёсцы?

## Адкрытыя

- Дапамагаюць атрымаць разгорнутыя адказы. Перадаюць пачуцці, меркаванні, уражанні і дэталі.
- Пачынаюцца з «што», «чаму», «навошта», «як», «раскажыце ...».

✅ Калі хочам атрымаць цытату, дэталі, індывідуальнае ўспрыманне.

∈ Чаму вы прыйшлі на сход?
∈ Раскажыце, чым вы займаліся, калі вам пазваніла Джоан Роўлінг?

## Удакладняючыя

- Дазваляюць упэўніцца, што правільна пачулі і зразумелі суразмоўцу.

✅ Калі патрэбна толькі пацвярджэнне інфармацыі.

∈ Ці правільна я зразумеў, што на АЭС вы працавалі тры гады?

# Тэхніка «варонка пытанняў»

Выкарыстоўваецца, калі неабходна атрымаць ад суразмоўцы як мага больш дэталяў, давер і максімальна поўную карціну падзеі. Тэхніка выкарыстоўваецца ў продажах, пры следчых дзеяннях і ў журналістыцы.




## Прыклад

– Ці былі вы на канцэрце «Гуртам» 20 жніўня?
– Так.
– Вы былі там увесь час, ад 20 да 23 гадзін?
– Так, была.
– Ці маглі б вы прыгадаць, якія гурты там выступалі?
– «Лейбонік», «Пылай», «Наві».
– Ого, якія зоркі! «Наві» выступалі першыя ці апошнія?
– Апошнія, яны і праўда зоркі.
– А якія касцюмы былі ў «Наві»?
– Арцём у касцюме з капелюшам, а Ксюша – у чырвонай сукенцы.
– А што вы адчувалі пасля іх выступленне?
– Я валілася з ног ад стомленасці, бо была двое сутак на дзяжурстве, але вельмі чакала менавіта іх. І не дарма, у мяне нібыта крылы з’явіліся! Ні развод, ні праблемы на рабоце, ні катастрофа з грашыма ўжо так не разрывалі душу, нібы да псіхатэрапеўта схадзіла!

# Тры пытанні трэнерцы

Прыдумайце 3 пытанні,
якія вы задалі б,
калі бралі б партрэтнае інтэрв’ю
ў Зоі Хруцкай. Пастарайцеся
знайсці такія пытанні,
якія не паўтораць іншыя.



# Як рыхтавацца да інтэрв’ю

1. Запішыце мэту матэрыялу. Для чаго гэты кантэнт вашаму выданню, асабіста вам і вашай аўдыторыі? (Напрыклад, тэкст пра самага рэйтынгавага сучаснага беларускага шахматыста)
2. Знайдзіце суразмоўцу. Ці хапае ў яго кампетэнцый і ці зможа ён даць сакавітыя дэталі?
3. Пашукайце інфармацыю пра тэму ў розных крыніцах
4. Падрыхтуйце пытанні да суразмоўцы і падумайце пра іх паслядоўнасць. Самае складанае і непрыемнае пакідайце на фінал, але пасля яго завяршыце гутарку чым-небудзь нейтральным
5. Дамоўцеся на сустрэчу або званок
6. Вядзіце запіс размовы
7. Не саромейцеся задаваць удакладняючыя пытанні, перапытваць, што не зразумелі
8. Не спяшайцеся і не бойцеся паўз. Няхай іх запаўняе суразмоўца